## ПІСЬМЕННАСЦЬ 11-13 ст.

1 Разнавіднасці мовы ўсходніх славян 11-13 ст.

А) беларуская, руская

Б) вусная, пісьмовая

В) рэлігійная, свецкая

Г) усходнеславянская, старажытнаруская

2 Перадгісторыя літаратурнай мовы – гэта...

А) існаванне рускай мовы

Б) існаванне толькі вуснай мовы

В) рэлігійная пісьменнасць

Г) старaславянская мова

3 Тыпы старажытнарускай літаратурнай мовы 11-13 ст.

А) беларускі, рускі

Б) вусны, пісьмовы

В) кніжна-славянскі, народна-літаратурны

Г) усходнеславянскі, рэлігійны

4 Стылі літаратурнай мовы агульнаўсходнеславянскага перыяду

А) свецка-мастацкі

Б) кніжна-славянскі

В) справавы

Г) вусна-размоўны

5 Самы ранні вядомы пісьмовы помнік кніжна-славянскага стылю (назва, год)

А) Слова пра паход Ігаравы, 1345

Б) Астрамірава Евангелле, 1056-1057

В) Павучэнне Уладзіміра Манамаха, 1178

Г) Казанне аб Барысе і Глебе, 1265

6 Помнікі перакладной гістарычнай літаратуры

А) Аповесць аб Акіру Прамудрым
Б) Слова пра паход Ігаравы
В) Малітвы Кірыла Тураўскага
Г) вершы Андрэя Рымшы

7 З якой мовы перакладзена “Александрыя” ў 12 ст.?

А) руская
Б) польская
В) лацінская
Г) чэшская

8 У чым адрозненне “Казання аб Барысе і Глебе” ад кананічнай формы жыція?

А) няма адрозненняў
Б) напісаны на польскай мовы
В) аповед толькі аб смерці герояў
Г) не апісваецца ўсё жыццё князёў

9 Узоры аратарскай мовы 11-13 ст.

А) Слова пра паход Ігаравы
Б) Александрыя
В) Словы і малітвы Кірыла Тураўскага
Г) Евангелле

10 Адрозненні мовы справавой пісьменнасці 11-13 ст. ад мовы кніжнаславянскай

А) няма адрозненняў
Б) шматлікія элементы старажытнарускай гаворкі
В) стараславянская лексіка
Г) ёсць паланізмы

11 Помнікі справавой пісьменнасці 11-13 ст.

А) Руская праўда
Б) Грамата князя Мсціслава
В) Грамата княгіні Ульяны
Г) Павучэнне Уладзіміра Манамаха

12 Якія рысы тагачаснай жывой гаворкі сустракаюцца ў помніках справавой пісьменнасці?

А) няпоўнагалоссе

Б) поўнагалоссе

В) ж, ч, ъл, ър

Г) жд, щ

13 Помнікі свецка-мастацкай літаратуры

А) Руская праўда

Б) Слова пра паход Ігаравы

В) Аповесць мінулых гадоў

Г) Павучэнне Уладзіміра Манамаха

14 Сэнсавыя (семантычныя) старaславянізмы...

А) маюць адпаведнікі ў старажытнарускай мове

Б) запазычанні з грэчаскай мовы

В) тэрміны, назвы рэлігійных, абстрактных паняццяў

Г) не маюць адпаведнікаў у старажытнарускай мове

15 Стылістычныя стараславянізмы

А) маюць адпаведнікі ў старажытнарускай мове

Б) ужываюцца для надання тэксту ўзнёсласці, урачыстасці

В) тэрміны, назвы рэлігійных, абстрактных паняццяў

Г) не маюць адпаведнікаў у старажытнарускай мове

16 Як выяўляецца паўднёваславянскі ўплыў у мове “Слова пра паход Ігаравы”?

А) поўнагалоссе

Б) няпоўнагалоссе

В) ръ, лъ паміж зычнымі

Г) аорыст, імперфект

17 Як суадносяцца поўнагалосныя і няпоўнагалосныя рысы ў “Слове пра паход Ігаравы”?

А) поўнагалосныя формы не ўжываюцца

В) няпоўнагалосныя ўжываюцца ў метафарычным значэнні

Б) поўнагалосныя формы ўжываюцца для перадачы звычайных, побытавых падзей

Г) няпоўнагалосныя і поўнагалосныя формы ўтвараюць рытміка-меладычную афарбоўку тэксту

18 Як тып старажытнарускай літаратурнай мовы з'яўляецца асновай мовы помнікаў свецка-мастацкай літаратуры?

А) народна-літаратурны

Б) кніжна-славянскі

В) народна-літаратурны і кніжна-славянскі

Г) царкоўнаславянская мова старажытнарускай рэдакцыі